*прадстаўлены больш за 2500 прыбораў вымярэння часу, якія былі створаны за апошнія 700 гадоў.)*

**II. Паўтарэнне вывучанага.**

**Праца з падручнікам.**

Практыкаванне 18.

— Прачытайце словы. Складзіце з іх сказ і запішыце. Назавіце ў сказе дзейнік і выказнік. Якой часцінай мовы з'яўляецца дзейнік (выказнік)? Пастаўце пытанні да дадзеных членаў сказа. Якімі часцінамі мовы з'яўляюцца словы ***асенні, за, акном***?

— Разгледзьце ўважліва табліцу на с. 13. Назавіце вядомыя вам часціны мовы. Якія часціны мовы змяняюцца па ліках? *(Назоўнік, прыметнік, дзеяслоў.)* Якая часціна мовы мае род? *(Назоўнік.)* Прывядзіце прыклады назоўнікаў мужчынскага, жаночага, ніякага роду. Якія часціны мовы могуць змяняцца па родах? *(Прыметнік, дзеяслоў.)* У форме якога ліку прыметнік змяняецца па родах? Прывядзіце прыклад прыметніка адзіночнага ліку ў форме мужчынскага, жаночага і ніякага роду. У якой форме часу дзеяслоў змяняецца па родах? Прывядзіце прыклад дзеяслова прошлага часу адзіночнага ліку ў форме мужчынскага, жаночага і ніякага роду. Якую ролю ў сказе можа выконваць назоўнік (прыметнік, дзеяслоў)? Якая з вядомых вам часцін мовы не змяняецца? Для чаго служыць прыназоўнік у сказе?

Практыкаванне 19.

— Прачытайце верш. (Адзін вучань чытае, астатнія слухаюць і сочаць за правільнасцю вымаўлення ўсіх слоў у тэксце.) Пра якую прыродную з'яву ідзе размова ў творы? Якое яшчэ значэнне мае слова *лістапад*? *(Назва апошняга месяца восені.)* Спішыце. Зверху над словамі пазначце, якой часцінай мовы яны з'яўляюцца. *(Запіс з каменціраваннем.)* Вызначыце род і лік прыметнікаў. Падкрэсліце дзейнік і выказнік у другім сказе.

Практыкаванне 20.

— Прачытайце. (Чытанне тэксту вучнямі сам сабе.) Колькі сказаў у тэксце? (Вучні выказваюць свае меркаванні.) Прачытайце першы сказ. (Вызначэнне межаў сказа.) Запішыце яго. (Запіс з каменціраваннем. Аналагічна вылучаюцца і запісваюцца астатнія сказы тэксту.) Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы да назоўніка *шпачаня́*. *(**Шпа**чыныя, **шпако**ўні, **шпакі**.)* Выдзеліце ў іх корань. Якія зычныя гукі змяніліся ў корані гэтых слоў? Пазначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца аднакаранёвыя словы. (Запіс з каменціраваннем.) Разгледзьце схему сказа на с. 14. Дзе ў гэтым сказе знаходзіцца дзейнік? *(У канцы сказа.)* На якое пытанне адказвае дадзены член сказа, які паясняе дзейнік (выказнік)? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце сказ, які адпавядае схеме. *(Першы сказ.)*

Практыкаванне 21.

— Прачытайце словы першай групы. Знайдзіце сярод іх лішняе. *(Ляцяць.)* Што аб'ядноўвае астатнія словы ў радзе? *(Прыметнікі.)* Вызначыце лік і род гэтых прыметнікаў. (Аналагічна аналізуюцца словы астатніх груп.) Прыдумайце і запішыце сказ. Выкарыстайце ў ім па адным слове з кожнага рада. (Напрыклад: *Чырвоныя яблыкі ляжаць у кошыках.*) Форму якога слова змянілі? *(Кошыкі — кошыках.)* Для чаго вы гэта зрабілі? Абазначце канчатак у слове кошык**ах.** Знайдзіце ў сказе назоўнікі. Вызначыце іх род.

Практыкаванне 22.

— Прачытайце прыказку, карыстаючыся падказкай. *(Восень на рабым кані ездзіць.)* Якое значэнне мае слова *рабы́* ў сказе? *(Не аднаго колеру, пярэсты, з плямамі іншага колеру.)* Якая прыродная з'ява прыгадваецца ў прыказцы? *(Змена колеру лісця на дрэвах восенню.)* Запішыце прыказку. Вызначыце, якой часцінай мовы з'яўляецца кожнае слова ў ёй. Абазначце час і лік дзеяслова *(Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца калектыўная праверка.)*

**III. Дамашняе заданне.**

Практыкаванне 23.

**IV. Вынік урока.**

— Назавіце вядомыя вам часціны мовы. Якая з іх не змяняецца? Як змяняюцца назоўнікі (прыметнікі, дзеясловы)? Якую ролю ў сказе выконваюць назоўнікі (прыметнікі, дзеясловы)?

# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі. IV клас*

***Сёння.***

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія.*

С В Ё В Н В Н В Я В

*Запішыце слова, якое атрымалася.*

*2. Якія літары (або літара) «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

н нн

сё..я

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

*Запішыце слоўнікавае слова, падзяляючы яго для пераносу рознымі спосабамі.*

*3. Дапоўніце верш слоўнікавым словам.*

**Падарунак**

_______ свята ў нашай хаце,
рады тата, я і брат.
Падарыў дзед нашай маці
новы фотаапарат.

*(Уладзімір Мацвеенка* [1, с. 33]*)*

*Падкрэсліце дзейнік і выказнік у другім сказе. Знайдзіце ў ім назоўнікі другога скланення, вызначыце іх склон.*

*4. Дапоўніце верш слоўнікавым словам, сінонімам да выдзеленага слова. Чаму вершы ў выкананні паэта падаліся вучням больш цікавымі?*

**Жаданы госць**

У вазе цюльпанаў букет,
а госць у нас _________ — паэт.
Дзіцячыя кніжкі чыталі,
самога ж паэта не зналі.
Усё, што мы чулі раней,
**Сягоння** было цікавей,
Таму што чытаў сам паэт.
Яму — наш прыгожы букет.

*(Ніна Галіноўская* [2]*)*

*Вызначыце склон назоўніка паэт ў сказах.*

*5. Дапоўніце прыказкі слоўнікавым словам. Растлумачце сэнс кожнай прыказкі.*

_________ зробіш — заўтра як знойдзеш.

Не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць _________.

*Выпішыце з прыказак антонімы.*

*6. Прачытайце словы. Закрэсліце лішнія літары ў дужках.*

Сё(н/нн)я, сё(н/нн)яшні.

*Падкрэсліце прыметнік.*

***Улетку.***

*1. Расшыфруйце і запішыце слоўнікавае слова.*

| 3 | 2 | 1 | 4 | 6 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| е | л | у | т | у | к |

*2. Дапоўніце акразагадку слоўнікавым словам і адгадайце яе.*

Будуе дом на дрэве _________.
У чырвоных ходзіць ботах.
Славіць клёкатам палеткі.
Ежу ён нясе з балота
Любым родным дзеткам.

*(Мікалай Бусько* [3, с. 20]*)*

*Знайдзіце ў загадцы назоўнік у форме творнага склону. Выдзеліце яго канчатак.*

*Утварыце і запішыце форму творнага склону слова-адгадкі.*

*3. Дапоўніце прыказку слоўнікавым словам, антонімам да выдзеленага слова.*

Хто _______ балюе, той **узімку** галадуе.

***Балюе*** *— вядзе разгульнае жыццё, тут: не працуе.*

*4. Дапоўніце загадку слоўнікавым словам. Запішыце адгадку.*

Штодзень _________ шукаюць кветкі,
Бяруць нектар — салодкі дар.
Нясуць у соты, каб мёдам потым
З тых сотаў залатых
Частаваць усіх.
_________

*(Міхась Пазнякоў* [4, с. 249]*)*

*Знайдзіце ў тэксце формы аднаго і таго ж слова, абазначце ў іх канчатак і аснову.*

*5. Прачытайце скорагаворку. Дапішыце ў слоўнікавыя словы прапушчаныя літары.*

**Стане аграномам**

Лёня ..летку пастараўся,
Лён палоў, не ленаваўся.
Залацістым лён стаў сё..я,
І шчаслівы вельмі Лёня.
Ганарыцца будзем Лёнем,
Бо ён стане **аграномам**.

*(Міхась Пазнякоў* [4, с. 111]*)*

*У першым сказе знайдзіце і падкрэсліце галоўныя члены.*

*Вызначыце скланенне і склон выдзеленага назоўніка, абазначце канчатак.*

*6. Дапоўніце прыказкі слоўнікавым словам. Растлумачце сэнс кожнай прыказкі.*

Усё ўзімку згадзіцца, што _______ ўрадзіцца.

Калі не будзе ўзімку бела, то не будзе _______ зелена.

*Выпішыце з прыказак антонімы.*

***Гараджане.***

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія.*

Г З А З Р З А З Д З Ж З А З Н З Е

*Запішыце слова, якое атрымалася. Пастаўце ў ім націск. Падзяліце слова на склады вертыкальнымі лініямі (|).*

*2. Пастаўце націск у словах. Дапішыце патрэбныя літары на месцы пропускаў.*

Г..р..джане, г..р..джанін, прыг..р..д, г..рад, г..р..дскі.

*3. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

[о] [дж] [ж] [а]

г[..]ра[..]ане

*Вызначыце форму ліку слоўнікавага слова.*

*4. Утварыце формы слоў па ўзоры. Абазначце іх канчаткі.*

палачан[е] — палачанін[ ] — палачанк[а]
гараджане — _________ — _________

*Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі:*

Жыхары горада — гэта _________. Мужчына, які жыве ў горадзе, — гэта _________. Жанчына, якая жыве ў горадзе, — _________.

*5. Знайдзіце сярод прапанаваных слоў лішняе і закрэсліце яго.*

Гарадскі, гарадзіць, гараджане, прыгарад.

*Абазначце корань у аднакаранёвых словах.*

*6. Дапішыце прапушчаныя літары ў слоўнікавыя словы.*

Гара..ане, гара..скі.

*Дапоўніце загадку патрэбным слоўнікавым словам.*

Два або адзін вагон — м в
і па рэйках коціць ён. р
Ты тут нават не гадай, — т а
гэта ________ ... . а й
*(Софья Шах* [5, с. 33]*)*

*Злучыце «рассыпаныя» літары так, каб атрымалася адгадка.*

***Секунда.***

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 5 | 1 | 7 | 3 | 4 | 6 | 2 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| н | с | а | к | у | д | е |

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове, падкрэсліце першы склад перад націскам.*

*2. У «чароўным квадраце» знайдзіце два слоўнікавыя словы і зафарбуйце іх.*

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| і | г | і | і | х | х | ф |
| і | р | і | і | х | х | ф |
| і | ы | і | і | х | х | ф |
| і | м | і | і | х | х | ф |
| с | е | к | у | н | д | а |
| і | ц | і | і | х | х | ф |
| і | ь | і | і | х | х | ф |

*Дапоўніце сказ гэтымі словамі ў патрэбнай форме:*

Бліснула маланка, праз некалькі ________ пачаў ________ гром.

*3. Злучыце выразы з іх значэннем. Устаўце на месцы пропускаў патрэбныя літары.*

**с..кунда ў с..кунду**

| у дакладна ўстаноўлены час | у самы бліжэйшы час, вось-вось | зусім ненадоўга |
|---|---|---|

**з с..кунды на с..кунду** **на адну с..кунду**

*Дапоўніце сказ патрэбным выразам.*

У прызначаны час — ____________ — сябры сустрэліся на стадыёне.

*4. Прачытайце словы. Устаўце прапушчаныя літары.*

☐ С..кунда, хвіліна, гадзіна.
☐ С..кунда, с..кундны, с..кундамер.

*Адзначце радок, у якім запісаны роднасныя словы.*

*5. Дапоўніце загадку слоўнікавым словам.*

__________, хвіліна, гадзіна,
і тыдзень, і месяц, і год — с
што гэта, — мы словам адзіным ч
ужо назавём без турбот. а
*(Софья Шах* [6, с. 39]*)*

*Злучыце «рассыпаныя» літары так, каб атрымалася адгадка.*

*6. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам у патрэбнай форме.*

Беглі сцежачкай ___________,
Шчабяталі сёстры ўслых, —
Выхваляліся ______________:
«Мы — хутчэйшыя за ўсіх.
Не паспееш "А-а" сказаць —
Нас ужо і не дагнаць!..»
Раз, два, тры!
Раз, два, тры!
Хто дагоніць?
Можа, ты?
*(Мікола Чарняўскі* [7, с. 2]*)*

*У назоўніках множнага ліку абазначце канчаткі.*

*7. Прачытайце. Дапоўніце верш слоўнікавым словам у патрэбнай форме.*

Можна літару ці лічбу
за ________ напісаць,
можна на кручок і рыбу
за ________ ўзяць...
Для хвіліны ж, ясна тут,
трэба шэсцьдзясят ________.
*(Софья Шах* [6, с. 6]*)*

*Вызначыце лік і склон слоўнікавага слова ў апошнім сказе. Абазначце ў гэтым слове канчатак.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт : вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / Уладзімір Мацвеенка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 48 с.
2. Вясёлка. — 2009. — № 7. — С. 18.
3. *Бусько, М.* Бабрыная навука : скорагаворкі, каламбуры, загадкі, акравершы, казкі : для мал. шк. узросту / М. Бусько. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 144 с.
4. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
5. *Шах, С. М.* Займальная граматыка для пачатковых класаў / С. М. Шах. — Мазыр : Белы Вецер, 2002. — 48 с.
6. *Шах, С. М.* Ад імгнення — да стагоддзя : дапам. для лагапедаў агульнаадукац. і спец. школ, дашк. устаноў, настаўнікаў пачатковых класаў. — Мінск : НМЦэнтр, 1998. — 52 с.
7. *Чарняўскі, М.* Сеў Аўторак у аўто... : для дашк. і мал. шк. узросту / Мікола Чарняўскі; маст. Я. Ларчанка. — Мінск : Фінансы, улік, аўдыт, 1997. — 23 с.



***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*